# ПАЭЗІЯ НІЛА ГІЛЕВІЧА: ЖАНРАВА-СТЫЛЁВАЯ АДМЕТНАСЦЬ

***І. П. Адамовіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*ilonaadamovich@mail.ru*

***Навуковы кіраўнік:*** Бельскі Алесь Іванавіч, доктар філалагічных навук, прафесар.

У артыкуле зроблена спроба разгледзець жанравую сістэму паэзіі Ніла Гілевіча. Акрэслены наватарскія, эксперыментальныя тэндэнцыі ў творчасці паэта, прааналізаваны арыгінальныя, найбольш рэпрэзентатыўныя ў фармальна-стылёвых адносінах тэкставыя структуры. Н. Гілевіч, арыентуючыся на цвёрдыя формы верша, агульнавядомыя паэтычныя жанры, стварыў адметныя мастацкія мадэлі, жанравыя інварыянты. Адзначаецца сінтэз формы і зместу ў вершаваных творах паэта, іх ідэйная, лірычная, філасофская напоўненасць, кампазіцыйна-стылёвая своеасаблівасць. Зварот Н. Гілевіча да новых жанравых форм, развіццё вершаванай архітэктонікі спрыялі ўзбагачэнню паэтычнай культуры аўтара і ў цэлым беларускай нацыянальнай паэзіі.

***Ключавыя словы:*** жанрава-тэматычны від; вершаваная форма; санетная форма; песенна-лірычны пачатак; актава; сямірадкоўе; танка; раман у вершах; творчая індывідуальнасць; паэт-наватар; творчы эксперымент.

Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч – асоба шырокага творчага дыяпазону: таленавіты паэт-лірык, эпік, сатырык, перакладчык, публіцыст, літаратуразнавец, крытык, фалькларыст. Ён – знаўца народнай душы і мовы беларускага народа, адданы сын роднай зямлі. Пра яго ведаюць далёка за межамі Беларусі, што адначасова сведчыць пра вядомасць і аўтарытэт нашай нацыянальнай літаратуры.

У розныя перыяды творчай дзейнасці Н. Гілевіч выяўляў сябе і адкрываўся чытачу па-рознаму: як юнак-рамантык, чалавек закаханы, лірык-песеннік, палымяны прамоўца, філосаф-думаннік, дасціпны жартаўнік – усё гэта арганічна паяднался, злілося, знайшло яскравае ўвасабленне ў яго самабытнай і шматграннай асобе. Кожны з аспектаў творчай індывідуальнасці Н. Гілевіча па-свойму адметны, цікавы і заслугоўвае даследчыцкай увагі.

Ніл Гілевіч – носьбіт беларускага слова, народна-нацыянальнага светаразумення. У роднай прыродзе, вясковым свеце, вуснай народнай

творчасці ён бачыў вытокі духоўнай красы і маральнай моцы чалавека. Эстэтычны ідэал для паэта – прырода, яе хараство і яе вышэйшае тварэнне – чалавек. Невыпадкова чалавек і прырода ў паэзіі Н. Гілевіча – духоўнае адзінства, непадзельнае цэлае. Адметны жанрава-тэматычны від яго паэтычнай творчасці – пейзажны верш. Любоў, замілаванне – вось з чаго пачынаецца экалагічнасць пачуцця Гілевіча-паэта. Эстэтычная прывабнасць лірычнага пейзажу ў творчасці Н. Гілевіча адзначаецца ў крытычных артыкулах, прысвечаных першаму зборніку паэта, у публікацыях пазнейшага часу (П. Макаль, Г. Сіненка, У. Конан, А. Бельскі, Т. Нуждзіна і інш.). Важную ролю ў вобразным мысленні паэта пачынае адыгрываць умоўнасць, мастацкая дэталь, а таксама такія сродкі паэтычнай выразнасці, як адухаўленне, алегорыя, эпітэт, паўтор і некаторыя іншыя («Мой сіні бор, мой родны бор зялёны!..», «Замірае, сціхае мая залатая дуброва…», «Свята зямлі» і інш.). У вершы «Колькі раздолля ты дорыш жыццю» (1953) паэт услаўляе вясну як пару адраджэння і абнаўлення прыроды. Канкрэтныя прыметы вясны перарастаюць сваё непасрэднае значэнне і набываюць сімвалічнае гучанне: «Колькі раздолля ты дорыш жыццю, // Край мой узгоркавы, край мой лясны! // Зноў, праяснеўшы ад замецей-сцюж, // Неба адбілася ў люстрах вясны. // Бор, перакулены ўніз галавой, // Топіць у возеры радасны гул…», на гэту акалічнасць звяртае ўвагу Г. Сіненка [6, с. 34]. Верш «Цуд тварыўся – я праспаў…» (1960) – лірычна-настраёвая, гукажывапісная замалёўка прыроды. Тое ж самае можна сказаць і пра лірычны твор «Снежаньская імпрэсія» (1965) – гэта ўзор музычна-колеравага жывапісу словам.

Лірыка-эмацыянальнае ўспрыманне прыроды паступова ўключае ў сябе і публіцыстычны пафас, сацыяльныя абагульненні. У вершах на экалагічную тэматыку «Раўняюць хлопцы рэчку», «Сіняя пушча», «Загадка прыроды», «Даруйце, родныя бары і пушчы…», «Калі не апомнімся» паэт смела закранаў жыццёва важныя праблемы. Гэтыя творы насычаны глыбокім роздумам над сэнсам чалавечага быцця, гістарычнай роляй чалавека, у іх выяўляецца грамадзянскі неспакой аўтара. Н. Гілевіч адзін з першых у беларускай паэзіі 1960–1970-х гг. актуалізаваў праблему аховы прыроды, навакольнага асяроддзя. Пагаршэнне экалогіі ён звязваў з тэхнічным прагрэсам, з рацыяналістычным чалавекам эпохі НТР.

У паэзіі Н. Гілевіча гэтага часу выявілася філасофскае асэнсаванне дыялектычнай сувязі чалавека і прыроды. Прырода выступае не толькі як фон – яна арганічная складовая частка ў канцэпцыі асобы лірычнага героя. Прырода ў лірыцы паэта – жывая істота, актыўны дзейны персанаж, яна «салідарызуецца» з чалавекам, абуджае ў ім прагу жыцця, кліча да жыццялюбства, няўрымслівасці. У хвіліны смутку і гора прырода «спачувае», «спагадае» лірычнаму герою, дапамагае знайсці душэўную раўнавагу. У актаве «Не гаманіце, вербы, не будзіце…» (1963), створаным на фальклорнай аснове, ён просіць прыроду, яе сілы не парушаць глыбокі

сон маці, якая, даглядаючы дзіця, «задрамала толькі на дасвецці» [3, с. 143]. Экалагічны імператыў, пераняты ад Янкі Купалы, у творчасці Н. Гілевіча праяўляецца ў беларусацэнтрычнасці. Самаідэнтыфікацыя беларуса як грамадзяніна, яго любоў да свайго народа, да роднай мовы, да гісторыі краіны, звычаяў, традыцый, побыту народа – вось тое, што так моцна хвалявала Гілевіча-паэта, Гілевіча-публіцыста (вершы «Мова майго народа», «Вы не яе – вы сябе прыніжаеце», «Родная мова!..», «Нясмертны дух слова» і інш.).

Для стылістыкі многіх вершаў Н. Гілевіча характэрны лірычна-песенны пачатак, эўфанія роднай мовы, беларускага маўлення. Ён – знаўца паэтыкі беларускай народнай песні. Народная песня з яе меладычнасцю стала для паэта эстэтычным узорам і арыенцірам. Вуснае народнае спяванне прыкметна паўплывала і на арыгінальную лірычную творчасць Н. Гілевіча. Музыка і песня сталі спадарожнікамі жыцця і творчасці, яны выявіліся ў яго лірыцы яскрава і паслядоўна. Гэтая музычнасць светаадчування ўспрымаецца як яскравая, апазнавальная рыса нацыянальнай душы, беларускага менталітэту.

Песенна-лірычны пачатак выяўляўся ў розныя перыяды творчасці Н. Гілевіча абсалютна па-рознаму. Шасцідзясятыя гады – час узнёсла-рамантычнага ўслаўлення радасці жыцця, маладосці – былі, бадай, ці не самымі плённымі. Дыяпазон лірыкі Н. Гілевіча факусіраваўся ў адной, галоўнай, тэме таго перыяду – тэме роднага краю (вершы «Зямля бацькоў, *Лагойшчына* мая…», «*Край* мой беларускі, *край*!..» і інш.). Паэт складаў высока ўзнёслыя гімны і оды Бацькаўшчыне-Радзіме. Патрыятычная лірыка паэта 1960–1970-х гг. не страчвае сваю актуальнасць, надзённасць і па сёння, яна здольна «працаваць» на выхаванне нацыянальнага духу маладога чытача. Творамі «Я хаджу, закаханы…», «Вы шуміце, шуміце…», «Спадчына», «А дзе ж тая крынічанька?» аўтар сцвярджаў высокія нацыянальныя прыярытэты, жыццёва неабходныя ідэалы і прынцыпы, сярод якіх патрыятычны ідэал – найпершы, самы галоўны і вызначальны.

Заўважым: ужо раннім вершам Н. Гілевіча была ўласціва меладычнасць, якая часта пераходзіла ў напеўнасць, песеннасць. Такім па сваёй стылёвай афарбоўцы, напрыклад, з’яўляецца верш «Я паеду адна…» (1956): «Хлыне ў сэрца вясна, смутак гонячы прэч!» [3, с. 55]. Народна-песенныя матывы знайшлі ўвасабленне ў лірычных творах пра каханне, іх гучанне блізкае да складу беларускага нацыянальнага характару, беларускай душы. Верш «Ты ўсё не можаш дараваць…» (1960) – спавядальна-шчыры, яго лірычны герой перажывае драму, але разам з тым не страчвае сувязі са светам, пачуцця аптымізму, надзеі, верыць у моц і сілу кахання. На заключным этапе творчасці у інтымных вершах Н. Гілевіча знайшла эмацыянальна-пачуццёвы адбітак асабістая жыццёвая драма паэта, які перажыў глыбокую траўму – смерць сваёй каханай жанчыны: «Помню, сказала: // “Ой, як ты будзеш плакаць, // Калі я памру...” // Не, не ўяўляла яна

// Плачу майго землятрус» [4, с. 56]. Лірычны драматызм у падобных радках раскрывае ўнутраны свет перажыванняў і эмоцый аўтара. Як бачым, паэт мае свой уласны ідыястыль, для якога характэрны псіхалагізаваны лірызм, з аднаго боку, а з іншага – музычная экспрэсія слова.

Ніл Гілевіч заўсёды дэманстраваў адметныя пошукі ў галіне паэтычнай формы. Яго творчыя эксперыменты, нароўні з творамі іншых сучасных паэтаў, ствараюць наватарскае і самабытнае аблічча нашай нацыянальнай літаратуры.

Ніл Гілевіч – майстар беларускага санета. Традыцыйная санетная форма патрабуе пабудовы твора з двух чатырохрадкоўяў і двух трохрадкоўяў, дзе ў катрэнах падаецца развіццё тэмы, а ў тэрцэтах – кульмінацыя і развязка з рыфмай *абба абба* ці *абаб абаб*. Н. Гілевіч стварыў свой санет на ўзор санетаў У. Шэкспіра ў форме трох чатырохрадкоўяў і аднаго заключнага двухрадкоўя (так званы санет шэкспіраўскага тыпу). Адметнасць шэкспіраўскага санета Н. Гілевіча ў тым, што паэт выкарыстоўвае традыцыйную санетную рыфмоўку (*абба абба*), а не рыфмоўку санета шэкспіраўскага тыпу (*абаб вгвг деде жж*). Ён сінтэзуе форму традыцыйнага санета і яго разнавіднасці – санета шэкспіраўскага тыпу:

*«Нас тут было чатыры мільёны!» –*
*Крычыць жахлівы надпіс са сцяны.*
*«Усім, усім падпальшчыкам вайны*
*На ўсе вякі мы шлём праклёны!»* [2, с. 42].

У 1967 г. выйшла паэтычная кніга Н. Гілевіча «Пеpазовы», у якую ўвайшоў адзін з першых у беларускай літаратуры вянок санетаў «Нарач» (пасля да гэтай мастацкай формы звярнуліся А. Сербантовіч, Я. Сіпакоў, Х. Жычка, У. Дзюба і інш.), прысвечаны выдатнаму паэту XX ст. Максіму Танку.

Пра Н. Гілевіча як наватара ў галіне вершаванай формы часта гавораць, маючы на ўвазе яго сяміpадкоўі. Ён – адзін з тых нямногіх паэтаў, хто звярнуўся да даўно забытай традыцыйнай формы. Сяміpадкоўе, ці септыма (ад лац. *Septima* – сёмая) – сяміpадковая страфа на адну, дзве або тры рыфмы з рознай схемай рыфмоўкі: *ааБввБв, аБаБввБ, ааБвваБ, ААББВВБ* і інш. [5, с. 383]. Дзякуючы варыянтнасці рыфмоўкі, аўтар змог выкарыстаць рознага кшталту размоўныя інтанацыі, якія працягваюць традыцыю яго песеннай лірыкі.

Адмысловымі паэтычнымі формамі, якімі плённа карыстаўся Н. Гілевіч, з'яўляюцца актава і васьміpадкоўе, ці актэт. Выразную мяжу паміж гэтымі дзвюма формамі праводзіць сам паэт у зборніку «Актавы» (1976): «У традыцыйным разуменні актава – гэта васьміpадковая страфа з рыфмоўкаю *АБАБАБВВ*. Тэрмін паходзіць ад італьянскага *ottava rima* – "васьміpадкоўе". Менавіта ў значэнні "васьміpадкоўе"

(васьміpадкоўе наогул, а не пэўнай “узаконенай” будовы) і ўжываецца гэты тэрмін у кнізе. Побач з актавамі кананічнай формы ў ёй змешчаны васьміpадковыя вершы з вольнай і таму самай разнастайнай кампаноўкай рыфмаў. Склалася гэта кніга не адразу. Першая невялікая нізка васьміpадкоўяў была напісана мною яшчэ ў 1961 годзе. Зрэдчасу звяртаўся я да гэтай формы і пазней. Але пераважная большасць вершаў напісана нядаўна – у апошнія тры-чатыры гады» [1, с. 5–6]. Н. Гілевіч у цыкл «Актавы» ўключыў каля дзесяці вершаў («Святочны, старажытны дух калядны…», «Куды ні глянь – над дахам строй антэн…», «Нам разам трыццаць. Мы стаім на кладцы...», «Здзіўляешся: за што табе я ўдзячны?..» і інш.). У вершах-актавах аўтар выказваў самае дарагое і запаветнае, тое, што вынашана і здабыта ў пакутных роздумах і духоўных пошуках. Ён выяўляе філасофскі роздум пра сэнс быцця, асэнсоўвае маральна-этычныя праблемы жыцця і інш.

Адметнай у паэтычнай творчасці Н. Гілевіча стала форма танка. Зборнік «На флейце самоты» (2004) Н. Гілевіча цалкам складаецца з пяцірадовікаў – вершаў у форме танка. Гэта лірычныя мініяцюры, яны складаюць два сшыткі кнігі. Танка – адзін з асноўных класічных жанраў японскай паэзіі. Сам жа паэт пра новую форму ў яго творчасці напісаў так: «Трыццаць адзін склад // Уціснуць у пяць радкоў // Строга па схеме: // Пяць-сем-пяць-сем-сем, – і ўсё! // Вось вам, сябры, і “танка”» [4, с. 5]. Форма танка ў творчасці Н. Гілевіча набыла інтэлектуальна-філасофскую змястоўнасць, афарыстычнасць, напоўнена духоўным пошукам сэнсу чалавечага існавання.

Вялікае значэнне для беларускай літаратуры меў выхад рамана ў вершах Н. Гілевіча «Родныя дзеці» (1985). Твор, як і належыць раману, мае эпічна-апавядальны характар, але па-сапраўднаму прыцягальным яго робяць менавіта лірычныя адступленні. Лірычны пачатак становіцца дамінантай і ў раскрыцці сюжэта, і ў структурнай арганізацыі нетрадыцыйнай формы эпічнага твора. Бадай, пасля Коласавай «Новай зямлі» гэта адно з самых значных дасягненняў у галіне вершаванага эпасу.

Н. Гілевіч шмат эксперыментаваў з эпічна-лірычнай формай, што ўвасобілася ў такіх яго творах, як вершаваная камедыя «Формула іржавіны», вершаваныя апавяданні і фельетоны («Балбешка», «Чалавечак», «Пісьмо ў рэдакцыю» і інш.), сатырычная паэма («Ачмурэнне», «Гэй, наперад! Гэй, назад!» і інш.). Непаўторна і па-новаму загучалі эпічныя творы паэта.

Як мы пераконваемся, Н. Гілевіч – паэт-наватар, які смела ішоў на творчы эксперымент. Ва ўсім павінна быць эстэтычная мера і эстэтычны густ – гэта, бадай, адна з асноўных дамінантаў, якая прадвызначала мэту фармальна-стылёвых пошукаў Н. Гілевіча на кожным этапе яго творчасці.

Паэтычныя наватворы Н. Гілевіча дазволілі нашай нацыянальнай літаратуры яшчэ бліжэй дакрануцца да літаратуры сусветнай. У сваю ж чаргу цяпер сусветная літаратура, дзякуючы творчым набыткам Н. Гілевіча,

уключаецца ў кантэкст беларускай літаратуры: паэт стварыў па-беларуску яркія мастацкія эквіваленты, пераўвасабленні, яскравыя паэтычныя формы. У гэтым плане ён – прадаўжальнік творчых ідэй і традыцый Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, звязаных з эстэтычным узвышэннем і ўзбагачэннем беларускай нацыянальнай літаратуры.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Гілевіч Н.* Актавы. Мінск: Маст. літ., 1976. 142 с.
2. *Гілевіч Н.* Выбраныя творы / уклад., камент. Н. Гілевіча; прадм. У. Конана. Мінск : Кнігазбор, 2009. 350 *с.*
3. *Гілевіч Н. З*бор твораў : у 23 т. Мінск : Кніга, 2003. Т. 1. 416 с.
4. *Гілевіч Н.* На флейце самоты: лірычныя мініяцюры ў жанры «танка». Мінск : Про Хрысто, 2004. 92 с.
5. *Рагойша В.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд., дапрац. і дапоўн. Мінск : Беларус. навука, 2004. 576 с.
6. *Сіненка Г. Д.* Ніл Гілевіч : нарыс творчасці. Мінск : Вышэйш. шк., 1981. 269 с.

## ЦІШКА ГАРТНЫ – ПАЧЫНАЛЬНІК УРБАНІСТЫЧНАЙ ПАЭЗІІ

***А. І. Бельскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*a_belsky@tut.by*

Упершыню вершы Цішкі Гартнага пра горад разглядаюцца як адзінае тэматычнае цэлае і ў кантэксце станаўлення беларускай урбаністычнай паэзіі. Паэт па-свойму адметна ўвасобіў вобразны свет роднага мястэчка, прастору вялікага горада. Аб’ектам паэтычнага сузірання сталі не толькі рэаліі беларускага горада, але і локусы, рэчаіснасць Берліна. Цішка Гартны стварыў яскравыя ўрбаністычныя замалёўкі, пры гэтым перадаў свае ўражанні і настроі. Асобныя гарадскія тэксты паэта маюць імпрэсіяністычныя рысы, прыкметы містычнага сімвалізму. Урбанізм як адметны тып мыслення пашыраў вобразна-тэматычныя і выяўленча-стылёвыя абсягі беларускай паэзіі 1920-х гадоў.

***Ключавыя словы:*** урбаністычная паэзія; гарадская тэма; урбанізм; урбаністычны пейзаж; вобразная структура; паэтычныя ўражанні.

У першай трэці XX ст. надзвычай хутка і прыкметна адбывалася станаўленне жанравай сістэмы беларускай паэзіі, пачаў пашырацца яе тэматычны і вобразны склад, запачаткоўваліся новыя плыні і кірункі. Адным з самых значных і яскравых паэтаў-наватараў стаў Максім Багдановіч, які, апрача іншага, з’яўляецца агульнапрызнаным пачынальнікам урбаністычнай паэзіі. Праўда, наспела патрэба змясціць акцэнты ў літаратуразнаўчым дыскурсе датычна гарадской тэмы ў айчыннай паэзіі, на што мы звярталі ўвагу ў ранейшых публікацыях [2]. Гістарычная і тагачасная Вільня знайшла ўвасабленне ў творах Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Ануфры Петрашкевіча і некаторых іншых паэтаў XIX ст. Асабліва